# Якуб Колас «На рэчцы» (урывак з паэмы «Новая зямля»)

Параўнанне як мастацкі троп

**С. В. Горбік,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
СШ №7 г. Ваўкавыска

***Мэта:*** засяродзіць увагу вучняў на казачна-адухоўленым свеце прыроды, шматфарбнасці карцін, багацці вобразаў; развіваць уменні вучняў узнаўляць карціны прыроды, створаныя паэтам з дапамогай вершаванай мовы і мастацкіх тропаў, сачыць за развіццём дзеяння, аналізаваць паводзіны героя, яго эмацыянальны стан, душэўнае ўзрушанне.

***Задачы:***

- пазнаёміць вучняў з творам, раскрыць вобраз Костуся, прааналізаваць вобразы ракі і марозу;
- развіваць уменні вучняў узнаўляць карціны прыроды, створаныя паэтам з дапамогай вершаванай мовы і мастацкіх тропаў, сачыць за развіццём дзеяння, аналізаваць эмацыянальны стан героя, яго душэўнае ўзрушэнне;
- выхоўваць любоў да прыроды, беражлівыя адносіны да яе, спрыяць выпрацоўцы грамадска значымых якасцей: сяброўства, калектывізму.

**Тып урока:** камбінаваны з выкарыстаннем элементаў тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення.

**Абсталяванне:** падручнік; партрэт Якуба Коласа; дапаможны матэрыял (малюнкі)

## ХОД УРОКА

### I. Падрыхтоўчы этап

Урок мы сёння пачнем з верша Якуба Коласа, паслухайце і падумайце, як ён звязаны з тэмай нашага ўрока.

**НА РЭЧЦЫ ЗІМОЮ**

Не сядзіцца ў хаце
Хлопчыку малому:
Кліча яго рэчка,
Цягнуць санкі з дому...

– Мамачка-галубка! –
Просіць ён так міла:
Можа б, ты на рэчку
Пагуляць пусціла?

Я не буду доўга,
Зараз жа вярнуся:
Трошачкі на рэчцы
У санках паважуся.

– Ну, ідзі, пабегай,
Толькі апраніся
Ды глядзі ў палонку,
Сынку, не ўваліся.

**II. Арганізацыйны момант**

**III. Этап актуалізацыі ведаў вучняў**

Вы пазнаёміліся з тэкстам “На рэчцы”, праверым, наколькі вы былі ўважлівымі.

**Лексічная работа**

*Суаднясіце словы ў левым і правым слупку.*

| | |
|---|---|
| ***шыбуе*** | правяраць трываласць |
| ***мацуе*** | хутка ісці |
| ***скаўзанецца*** | затрашчыць |
| ***закохкае*** | цвёрды, упарты |
| ***запраторыш*** | шалаш |
| ***націна*** | кволая расліна |
| ***салаш*** | схаваць |
| ***зацяты*** | паслізнецца |

Якія яшчэ словы для вас незразумелыя?

**Уступная гутарка**

Вызначым мэты ўрока.

*Прыкладныя адказы дзяцей:*

- даведаемся, што такое параўнанне;

- характарызаваць галоўнага героя;

- знаходзіць мастацкія сродкі ў творы;

- вучыцца бачыць прыгажосць у прыродзе.

**IV. Этап вывучэння новага матэрыялу**

Пытанні:

- Якім настроем прасякнуты твор? *(Вясёлым, хлопчык вельмі радуецца прыходу зімы.)*
- Якімі словамі Якуб Колас намаляваў карціну зімы? *(Марозік крэпіць, лёд таўшчэе... Мароз бязжаласны і люты!...)* Супастаўце з малюнкам. (Дадатак 1.)
- Якое месца ў творы вам асабліва спадабалася і чаму? *(Магчыма, дзеці ўспомняць пра сустрэчу Костуся з ракой і ялінкамі.)*

**V. Аналіз мастацкага твора (праца ў групах: 1 – вобраз Костуся; 2 – вобраз прыроды)**

1.

| Пытанні для 1 групы | Пытанні для 2 групы |
|---|---|
| • У любым літаратурным творы ёсць галоўны герой. Назавіце яго. *(Костусь)*<br>• Як вы думаеце, як выглядае хлопчык Костусь? Намалюйце яго словамі.<br>• Куды хадзіў хлопчык? Для чаго? *(на раку, у лес, паназіраць за прыродай, бо любіў прыроду)* | • А каго або што так ярка малюе Якуб Колас ва ўрыўку? *(раку, лес, мароз)*<br>• Для чаго браў з сабой сякерку Костусь*? (рабіў насечкі ў лёдзе на рацэ)*<br>• Дык чым рэчка Костуся займае? Свой адказ падмацуйце цытатамі. *(незвычайнай прыгажосцю)* |
| • Якія мастацкія сродкі выкарыстоўвае аўтар для апісаня? *(Эпітэты: скрэпы ледзяныя; рэчка вольная.Адухаўленні: мароз на небе ставіць троны.)* | |

2. Работа з падручнікам. Прачытайце яшчэ раз тэму нашага ўрока, звярніце ўвагу на другую частку: параўнанне як мастацкі троп.

3. Складзіце характарыстыку Костуся ў выглядзе сінквейна.

Костусь

Уражлівы, чуллівы (*незвычайны, ранімы; дзейсны, цікаўны)*

Гуляе, радуецца, марыць (*фантазіруе, майструе, творыць; ратуе, выдумляе, любуецца*)

Вельмі незвычайны хлопчык *(вельмі ўражлівая натура; сапраўдны мастак)*

Летуценнік (*фантазёр; твярэц*)

**VI. Этап арганізацыі асэнсавання вывучанага матэрыялу і першасная праверка ведаў вучняў** (Дадатак 2; малюнкі на дошцы)

- Зачытайце тое месца ў творы, якое адпавядае малюнку *("А маладзенькія ялінкі…" с. 138, "Замерзла рэчка…" с. 139, " Ну ж і мароз …" с. 137.)*
- На адным малюнку намаляваны хлопчык. Як вы думаеце, гэта можа быць Костусь? (Дадатак 3.) Знайдзіце несупадзенне *(абутак, адзенне, санкі)*
- А зараз паспрабуйце вы сябе ў якасці паэта, складзіце некалькі радкоў пра зіму з дапамогаў рыфмы:

*Прыйшла вясёлая* зіма,

*Не ўседзіць дома* дзетвара.

*Злуешся ты, мароз,* дарма,

*Дзіцячых забаў цяпер* пара.

*(У каго не атрымліваецца, той складае 5–6 сказаў.)*

**VII. Этап падвядзення вынікаў урока** (зварот да задач)

- Што новага вы даведаліся?
- Чаму навучыліся, як гэта звязана з тэмай урока?
- У каго былі цяжкасці і што дапамагло іх пераадолець?

**VIII. Этап інфармавання пра дамашняе заданне**

Падрыхтаваць выразнае чытанне ўрыўка твора з апісаннем прыроды, адказваць на пытанні ў падручніку.









